# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў РАЗВІЦЦІ ГРАМАДЗЯНСКАГА ПРАВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XIV–XVI стст.

***Ю. В. Ашмян***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Працэс пераходу ад звычаёвага права і прававых традыцый да пісанага, адзінага для ўсяго Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) заканадаўства, а ў далейшым пераход да якасна новай сістэмы выкладання прававога матэрыялу ў статутны перыяд дастаткова дакладна акрэслілі сферу грамадзянскіх праваадносін, садзейнічалі выпрацоўцы агульных палажэнняў грамадзянскага права і больш дакладнай юрыдычнай тэрміналогіі.

У XVI ст. грамадзянскае права ўздымаецца на якасна новую ступень развіцця. Права пачынае набываць агульнасаслоўны характар – паступова замест асобы пэўнай групы насельніцтва ў прававых адносінах пачынае выступаць абстрактная асоба: пакупнік, уласнік, залогатрымальнік і інш.

Развіццё таварна-грашовых адносін, гандлёвага капіталу, павелічэнне ролі гарадоў і гарадскога насельніцтва ў сацыяльна-эканамічным жыцці дзяржавы, стварэнне адзінага дзяржаўнага рынку прывялі да таго, што з другой паловы XVI ст. разам з асноўнымі інстытутамі ўласна феадальнага ладу актыўна развіваліся новыя прававыя нормы і інстытуты, характэрныя для капіталістычнага ладу (залогавае, абавязацельнае права, дагаворныя адносіны ў вобласці пазыкі, найму, падраду і інш.).

У законе XVI ст. замацоўваюцца асноўныя інстытуты грамадзянскага права, што закладвае асновы далейшага развіцця галіновай структуры права. У Статутах ВКЛ меліся цэлыя раздзелы, амаль поўнасцю прысвечаныя грамадзянскаму праву і яго асобным інстытутам («О тестаментах», «О записях и продажах» і інш.).

Пачынаюць больш выразна праяўляцца асноўныя элементы грамадзянскіх праваадносін: суб'екты, аб'екты, правы і абавязкі бакоў. Аднак, як і ва ўсіх феадальных дзяржавах, у ВКЛ не кожны чалавек прызнаваўся суб'ектам права. Поўная грамадзянская праваздольнасць патрабавала не толькі наяўнасці падданства дзяржавы, але і наяўнасць асабістай свабоды. Грамадзянскую дзеяздольнасць мужчыны атрымлівалі ў 18 гадоў, а жанчыны – у 13 гадоў, але нават пры дасягненні гэтага ўзросту жанчыны не атрымлівалі поўнай грамадзянскай правадзольнасці.

У гэты перыяд праяўляецца таксама тэндэнцыя ўраўнавання статуса ўсіх відаў землеўладанняў, чаму садзейнічала зямельная рэформа XVI ст. Статут 1566 г. дазволіў усім землеўласнікам распараджацца сваёй маёмасцю без абмежаванняў. Вынікам гэтага стала ўмацаванне маёмасных правоў шляхты адносна нерухомай маёмасці і адначасова абмежаванне ў правах простых людзей.

Заканадаўца ўсё большую ўвагу пачаў надаваць здзелкам. Юрыдычная здзелка перш за ўсё павінна была праявіцца знешне, прыняць адпаведную форму, па якой можна было б зрабіць вывад аб змесце здзелкі. У сувязі з гэтым статуты засяроджваюць увагу на больш тыповым і агульным. Яны пералічваюць віды здзелак, або гавораць аб наступствах іх невыканання, аднак дастаткова падрабязна рэгламентуюць форму іх здзяйснення.

З сучаснага пункту гледжання, у заканадаўстве ВКЛ XIV–XVI стст. мы не знаходзім поўнага, усебаковага і паслядоўнага выкладання норм грамадзянскага права з выдзяленнем у асобныя раздзелы аднатыпных юрыдычных адносін і інстытутаў. Гэта было звязана з тым, што заканадаўца не ставіў мэтай ахапіць усе бакі і віды грамадзянскіх праваадносін, а засяроджваў увагу на больш важных і галоўных, з яго пункту гледжання, відах праваадносін і іх элементах.